http://base.consultant.ru/cons/cgi/online.cgi?req=doc;base=ESU;n=243. – Дата доступа: 13. 02. 2020.

3. Гражданский процессуальный кодекс БССР 1964 года // Национальный правовой Интернет-портал Республики Беларусь [Электронный ресурс] / Нац. центр правовой информ. Респ. Беларусь. – Режим доступа: http://www.pravo.by. – Дата доступа: 25.02.200.

4. Сборник постановлений Пленумов Верховных Судов СССР и РСФСР (Российской Федерации) по гражданским делам. – М.: Спарк, – 2001. – 448 с.

5. Сборник нормативных актов по гражданскому процессу / С.Н. Бурова [и др.]; под ред. Н.Г. Юркевича. – Минск: Вышэйшая школа, 1978. – 352 с.

6. Кочиев, Т.Д. Судебная защита прав и интересов в сфере брачно-семейных отношений: учебное пособие / Т.Д. Кочиев [и др.]; под ред. Д.М. Чечота. – Ашхабад: МНО ТССР. – 1988. – 104 с.

7. Кодекс о браке и семье Белорусской ССР 1969 года // Национальный правовой Интернет-портал Республики Беларусь [Электронный ресурс] / Нац. центр правовой информ. Респ. Беларусь. – Режим доступа: http://www.pravo.by. – Дата доступа: 20.03.2020.

## СТАНАЎЛЕННЕ І РАЗВІЦЦЕ ПАЛІТЫКА-ПРАВАВОЙ ДУМКІ Ў БЕЛАРУСІ

**Л.Л. Голубева**
*дацэнт кафедры тэорыі і гісторыі дзяржавы і права юрыдычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, кандыдат юрыдычных навук, дацэнт*

Палітыка-прававая думка Беларусі ў сваім развіцці прайшла некалькі этапаў. Яе станаўленне пачалося ў перыяд распаўсюджвання хрысціянства і фарміравання беларускага этнасу. У XI – XIII стст. палітыка-прававая думка развівалася пад уплывам візантыйскай палітыка-прававой культуры. У гэты час з'яўляецца царкоўна-палітычная ідэалогія – цэзарапапізм (лац. cascara – "імператар" і лац. Papa – "папа", "айцец"), згодна з якой галава заканадаўчай, выканаўчай і судовай улады – імператар (цэзар) з'яўляецца адначасова і галавой хрысціянскай царквы. Канчатковай мэтай гэтай ідэалогіі было забеспячэнне адзінства і магутнасці царквы [1].

У XIV ст. уплыў візантыйскай палітыка-прававой культуры пачынае слабець, а заходнееўрапейскай – узмацняецца. У гэты час частка шляхецкай моладзі з ВКЛ пачынае сістэматычна атрымліваць вышэйшую юрыдычную адукацыю ў заходнееўрапейскіх універсітэтах.З'яўляецца царкоўна-палітычная ідэалогія папства – папацэзарызм, згодна з якой намеснікам Бога на зямлі разглядаўся ўжо прадстаўнік не свецкай (як у цэзарапапізме), а царкоўнай улады [1]. Знакамітымі асветнікамі ў дадзены час былі Е. Полацкая (1100 (?) – 1167 (?)), К. Тураўскі (1110 (?) – 1182 (?)), К. Смаляціч (1110 – 1164) і інш. Яны адмаўляліся ад усяго матэрыяльнага, уключаючы і царкоўную маемасць, у той

час як многія манастыры, цэрквы, асобныя святары з'яўляліся буйнымі ўласнікамі, рабілі акцэнт на духоўным, вечным [2].

Эпоха Адраджэння характарызуецца ўздымам свецкай навукі, станаўленнем нацыянальнай мовы, нацыянальнай самасвядомасці, гуманістычнага светапогляду. Такія гуманісты як Ф. Скарына (1490 – 1551), М. Літвін, А. Волан (1530 – 1610), М. Радзівіл-Чорны (1515 – 1565), Л. Сапега (1557 – 1633)і інш. засяродзілі ўвагу на інтарэсах чалавека, абвясціўшы задавальненне яго правоў першачарговымі. У цэнтры іх увагі знаходзіліся пытанні роўнасці людзей перад законам, рэлігійнай талерантнасці і палітычнага плюралізму. На дадзеным этапе назіраецца пераход да саслоўна-прадстаўнічай манархіі, распаўсюджваюцца ідэі гуманізму, фарміруецца нацыянальная філасофская, прававая і грамадска-палітычная думка.Рэфармацыйныя ідэі пачалі распаўсюджвацца на тэрыторыі Вялікага Княства Літоўскага (далей – ВКЛ) у другой чвэрці XIV ст. [3; 4].Ідэолагі рэфармацыйнага руху лічылі, што для выратавання душы веруючага не патрабуецца ўдзелу каталіцкай царквы, таму што выратаванне адбываецца не добрымі справамі, а ўнутранай верай. Прадстаўнікі Рэфармацыі (Я. Кішка (1552 – 1592), С. Будны (1530 (?) – 1593), В. Цяпінскі-Амельяновіч (1540 – 1604), П. Гезка (1525 (?) – 1573), М. Чаховіц (1532 – 1613), Л. Крышкоўскі (1536 (?) – 1573 (?)) і інш.) адмаўлялі неабходнасць існавання Рымскай Каталіцкай царквы, каталіцкага духавенства як асобнага сацыяльнага слоя, які згодна з вучэннем царквы надае чалавеку Божую ласку. Яны патрабавалі адчужэння царкоўнай маемасці (зямельнай уласнасці каталіцкай царквы) на карысць дзяржавы і прыватных асоб, ліквідацыі каталіцкіх кляштараў і манахаў, адмены царкоўнай дзесяціны, пышнага каталіцкага культу, стварэння дэмакратычнай і самакіравальнай таннай царквы. Адзінай крыніцай веры ідэолагі Рэфармацыі лічылі Свяшчэннае Пісанне і адмаўлялі значэнне Свяшчэннага Падання. Рэфармацыйны рух праявіўся ў ВКЛ пераважна ў формах лютэранства, кальвінізму (атрымаў найбольшае распаўсюджванне) і арыянства [4; 5].

У сярэдзіне XVI ст. у Еўропе ўзніклі контррэфармацыйныя ідэі, накіраваныя супраць ідэй і вынікаў рэфармацыйнага руху. Гэты этап характарызуецца перавагай рэлігійна-палемічнай літаратуры. У гэты час, што вельмі важна, адбываецца фарміраванне сярэдняй адукацыі (ва ўсіх гарадах Беларусі ствараюцца калегіумы (сярэднія навучальныя ўстановы)), а ў 1579 г. з'яўляецца першаяна беларускіх землях вышэйшая навучальная ўстанова – Віленская езуіцкая Акадэмія. Для прапаведвання ідэй Контррэфармацыі актыўна выкарыстоўваліся царкоўныя суды, манастырскія каталіцкія ордэны, вярхоўная, дзяржаўная ўлада шэрагу каталіцкіх краін (Іспаніі, Рэчы Паспалітай), рэакцыйныя рэлігійна-палітычныя групоўкі феадалаў і шляхты. Асаблівасцю дзейнасці езуітаў было тое, што яны не адасабляліся ад свецкага жыцця, а, наадварот, прымалі ў ім актыўны ўдзел і, такім чынам, актыўна ўплывалі на свядомасць людзей у патрэбным кірунку [4]. З канца XVII ст. выкарыстанне старажытнабеларускай мовы прыпыняецца, а сацыяльна-

палітычныя і прававыя думкі выказваюцца на лацінскай, польскай і рускай мовах. Іх змест звязаны з крытыкай феадальна-прыгонніцкай сістэмы, дзяржаўнага і судовага ўладкавання, сістэмы феадальнага права. Асноўнымі ідэолагамі Контррэфармацыі былі П. Скарга (1536 – 1612), І. Пацей (1541 – 1613), М. Сматрыцкі (1577 – 1633), А. Філіповіч (1595 (?) – 1648), Х. Філалет (1564 – 1624) і інш.[6].

Наступны этап у развіцці палітыка-прававой думкі Беларусі характарызуецца пранікненнем у другой палове XVIII ст. у Рэч Паспалітую з Заходняй Еўропы (з Францыі) асветніцкай ідэалогіі. Пад уплывам асветніцкай ідэалогіі ў ВКЛ пашыраюцца антыпрыгонніцкія ідэі, расце колькасць прыхільнікаў рэфармавання грамадства на новых буржуазна-дэмакратычных асновах. Носьбітамі прагрэсіўных ідэй з’яўляліся прадстаўнікі перадавой часткі шляхты, а таксама буржуазіі, якая нараджалася. Гэта І. Страйноўскі (1752 – 1815), І. Храптовіч (1729 – 1812), Т. Касцюшка (1746 – 1817), Я. Ясінскі (1759 (?) – 1794) і інш. [4]. У дадзены перыяд на беларускіх землях распаўсюджваюцца ідэі натуральнага права і дагаворнага паходжння дзяржавы; узнікаюць розныя праекты паляпшэння грамадска-палітычнага ладу Рэчы Паспалітай на аснове вопыту еўрапейскіх дзяржаў. Прымаецца адна з першых у свеце канстытуцый – Канстытуцыя 3 мая 1791 г.

У гэты час асаблівай папулярнасцю карыстаўся фізіякратызм. Фізіякраты сапраўднай крыніцай багацця лічылі зямлю, а сапраўднай прадукцыйнай працай – земляробскую працу. Таму яны крытыкавалі прыгоннае права, якое стрымлівала прагрэс у сельскай гаспадарцы, прапаноўвалі розныя праекты адмены прыгонніцтва, даказвалі неабходнасць фермерскага спосабу вядзення сельскай гаспадаркі [4]. Фізіякраты прытрымліваліся тэорыі натуральнага права і дагаворнага паходжання дзяржавы. Асновай вучэння вядомага прадстаўніка фізіякратызму І. Страйноўскага было вучэнне пра натуральны парадак і як вынік яго – натуральнае права. Натуральны парадак рэчаў ен разглядаў як адзінства фізічнага і маральнага парадку. На яго думку ніхто не мае права пазбавіць чалавека яго натуральнай свабоды. Ен павінен абараняць ад гвалту сваю ўласнасць і свабоду і, адпаведна, не рабіць замаху на чужую прыватную ўласнасць, не ўжываць сілы ў адносінах да іншых людзей, за выключэннем выпадкаў самаабароны. Прынцыпы натуральнага права ен разглядаў у якасці крытэрыяў “ісціннасці” або “няправільнасці” таго ці іншага сацыяльна-палітычнага ладу [6].

І. Храптовіч, вядломы фізіякрат, у сваей працы “Пра натуральнае права” звяртае ўвагу на наяўнасць у грамадстве “натуральнага парадку”, які ўстанаўлівае правы і абавязкі ўсіх членаў грамадства[7]. Для падтрымання такога парадку ў супольным жыцці заключаюцца дагаворы. Чым бліжэй закон да натуральнага права, тым найбольш ен справядлівы. Прагрэсіўным момантам у вучэнні І. Храптовіча з’яўляецца тое, што маральны парадак ен ставіць у залежнасць ад фізічнага парадку прыроды. Маральныя законы, на яго думку, цалкам адпавядаюць таму, што карысна і неабходна чалавеку ў яго жыцці. Як і

ўсе фізіякраты, грамадства ен разглядаў як натуральны арганізм, што складае частку прыроды, у якую ўваходзяць чалавек і яго маральныя прынцыпы. Калі ж чалавек не мае свабоды ці бяспекі або пазбаўлены ўласнасці, ен становіцца ізгоем, бескарысным для сябе і грамадства. І. Храптовіч лічыў чалавека і яго здольнасці, перш за ўсе разумовыя, галоўным элементам вытворчасці. Гаспадарчымі рэформамі і вызваленнем сялян ад прыгоннай залежнасці вучоны абгрунтаваў магчымасць узнаўлення грамадства [7]. Ен верыў, што пры належнай арганізацыі грамадскага жыцця ў адпаведнасці з патрабаваннямі “натуральнага права” ўзнікае магчымасць стварэння пастаянна растучай забяспечанасці і асветы для ўсіх.

У XIX ст. палітыка-прававая думка Беларусі развіваецца па трох асноўных ідэйных накірунках: ліберальна-буржуазнаму, кансерватыўна-манархічнаму, рэвалюцыйна-дэмакратычнаму. Развіцце палітыка-прававых ідэй характарызуецца ўплывам польскай і расійскай палітычнай думкі. Галоўнай праблемай уласна беларускай грамадска-палітычнай думкі, узнікшай у гэты перыяд, становіцца абгрунтаванне права беларускага народа на нацыянальна-культурную аўтаномію і палітычнае самавызначэнне. Перадавыя ідэі выказваюць студэнты і выкладчыкі Віленскага ўніверсітэта (Я. Чачот (1796 – 1847), Т. Зан (1796 – 1855), А. Міцкевіч (1798 – 1855) і інш.), Я. Снядэцкі (1756 – 1830), В. Страйноўскі (1759 – 1834), І. Лабажэўскі (1750 (?) – 1826), І. Даніловіч (1787 – 1843), М. Валловіч (1806 – 1833), Ф. Савіч (1815 – 1861), К. Каліноўскі (1838 – 1864) і інш. [1; 4].

У XX ст. працягваецца развіцце ідэі нацыянальнай дзяржаўнасці.Цэнтрам марксісцкай палітыка-прававой думкі сталі Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт (1921), Інстытут філасофіі і права АН БССР (1931). Першыя навуковыя працы па станаўленню і развіццю палітычнай і прававой думкі Беларусі з’явіліся ў 1930-я гг. Гэта былі даследаванні А. Луцкевіча (1884 – 1942), А. Цвікевіча (1888 – 1937), Г. Парэчына (1894 – 1938), А. Станкевіча (1891 – 1949) і інш.[4]. Аднак у той час гэтыя даследаванні не атрымалі працягу. Пасля Вялікай Айчыннай вайны цікавасць да гісторыі палітычнай і прававой думкі Беларусі ўзрасла. Пасляваенную грамадска-палітычную і прававую думку ў Беларусі развівалі І.І. Марціновіч, В.А. Круталевіч (1922 –2006), А.В. Дулаў (1924 – 2018), В.Ф. Чыгір, С.А. Падокшын (1931 – 2004), С.Ф. Сокал (1943 – 2020), С.П. Маргунскі (1911 – 1978), І.А. Юхо (1921 – 2004)і інш. Аднак даследаванні наконт станаўлення і развіцця поглядаў на дзяржаву, права, палітыку, заканадаўства актывізаваліся толькі з утварэннем суверэннай Рэспублікі Беларусь.У гэтым накірунку працуюць такія знакамітыя навукоўцы, як Т.І. Доўнар, В.Ф. Шалькевіч, І.У. Вішнеўская і інш. [4; 8; 9].

Такім чынам, можна з упэўненасцю сказаць, што ў нашай краіне на сенняшні дзень развіваюцца практычна ўсе найбольш значныя напрамкі палітычных і прававых даследаванняў і створаны трывалы фундамент для правядзення дальнейшых даследаванняў у галіне грамадска-палітычнай і прававой думкі.

**Бібліяграфічны спісак**

1. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 т. / Беларус. энцыкл.; рэдкал.: Г.П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск: БелЭн, 1993 – 2003. – Т. 4: Кадэты – Ляшчэня. – 1997. – 432 с.
2. Голубева, Л. Л. Гісторыя палітычнай і прававой думкі Беларусі: вучэб. метад. комплекс / Л. Л. Голубева. – Мінск: ГИУСТ БГУ, 2005. – 84 с.
3. Падокшын, С. А. Беларуская думка ў кантэксце гісторыі і культуры / С. А. Падокшын. – Мінск, 2003. – 316 с.
4. Шалькевіч, В. Ф. Гісторыя палітычнай і прававой думкі Беларусі / В. Ф. Шалькевіч. – Мінск: Маладзежнае навуковае суполніцтва, 2002. – 248 с.
5. Падокшын, С. А. Беларуская думка ў кантэксце гісторыі і культуры / С. А. Падокшын. – Мінск: Беларуская навука, 2003. – 316 с.
6. Асветнікі зямлі Беларускай: энцыкл. даведнік / рэдкал.: Г.П. Пашкоў і інш. – Мінск: БелЭн, 2001. – 496 с.
7. Храптовіч, І. Л. Аб прыродным праве / І. Л. Храптовіч – Вільнюс: SANTARA, 2014. – 219 с.
8. Гісторыя палітычнай і прававой думкі Беларусі XVI – XVIII стст.: хрэстаматыя / аўт.-склад. Т.І. Доўнар, Ю.П. Доўнар, Л.Л. Голубева; пад рэд. Т.І. Доўнар. – Мінск: БДУ, 2004. – 206 с.
9. Вішнеўская, І.У. Гісторыя палітычнай і прававой думкі Беларусі / І.У. Вішнеўская. – Мінск: Тэсей, 2004. – 271 с.

## О НЕКОТОРЫХ ВОПРОСАХ КРАУДСОРСИНГА В НОРМОТВОРЧЕСКОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ

**Е.П. Гуйда**
*старший научный сотрудник Национального центра законодательства и правовых исследований Республики Беларусь*

Использование информационно-коммуникационных технологий в нормотворческой деятельности позволяет активизировать общественный диалог, обратную связь с населением. В юридической литературе отмечается, что в современных условиях достижение наибольшей полноты и достоверности информации, необходимой для разработки как законопроектов, так и иных проектов нормативных правовых актов, возможно только при использовании информационных ресурсов, которые позволяют не только аккумулировать значительные объемы информации, но и осуществлять ее обработку в соответствии с конкретными целями и задачами как всего законотворческого процесса, так и каждого из его этапов [1, с. 47].

Новые формы взаимодействия граждан и государства получили название «краудсорсинг». Дословно термин «crowdsourcing» переводится как crowd – «толпа» и sourcing – «использование ресурсов». В научной литературе